**УДК 1(476)(091)**

# БЕЛАРУСКІ ФІЛАСОФСКІ ЛАНДШАФТ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ

***Г.І. КЛІМОВІЧ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаецца праблематыка спецыфікі развіцця беларускай філасофскай думкі ў першай палове XX стагоддзя. На гэты час беларуская філасофская думка адрознівалася эклектычнасцю. Даследчыкамі адзначаецца адначасовае існаванне на беларускай геакультурнай прасторы дыяметральна супрацьлеглых філасофскіх напрамкаў. Беларусь стала своеасаблівай арэнай напружанага дыялогу і супрацьстаяння не толькі філасофскіх, ідэалагічных, але і цывілізацыйных плыняў. Акрамя агульнавядомага сацыял-дэмакратычнага руху, плыні заходнерусізму, існаваў напрамак рэлігійнай філасофіі, у межах якога магчыма вылучыць праваслаўны і каталіцкі накірункі, фундзіраваныя адпаведна ідэямі рускай і заходнееўрапейскай традыцый, шэраг мысляроў ставілі сабе на мэце выпрацоўку нацыянальнай ідэалогіі, аб'ектам іх рэфлексіі была праблематыка этнадыцэі. Беларуская філасофская думка дагэтуль застаецца недастаткова даследаваным праблемным полем, таму мэтай дадзенага даследавання выступае вызначэнне яе асноўных плыней і спецыфічных рыс у азначаны перыяд.*

**Уводзіны.** Першая палова XX стагоддзя з'яўляецца перыядам, насычаным шматлікімі гістарычнымі падзеямі, якія аказалі значны ўплыў на фарміраванне асаблівасцей беларускай філасофскай думкі. Спецыфіка эканамічнай і палітычнай сітуацыі вызначыла асноўныя рысы і тэндэнцыі развіцця рэфлексіі беларускіх інтэлектуалаў у азначаны перыяд.

Дагэтуль існуе меркаванне, што асноўнымі філасофскімі з'явамі ў дадзены час былі плынь "заходнерусізму", а таксама звязаная з сацыял-дэмакратычнымі прынцыпамі дзейнасць прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага Адраджэння. Але гісторыя філасофскай думкі ў дадзены перыяд значна багацейшая. Так, за межамі даследаванняў гісторыкаў філасофіі застаецца рэлігійны напрамак.

Мэта дадзенага даследавання – вызначэнне спецыфікі развіцця беларускай філасофскай думкі першай паловы XX стагоддзя дасягаецца за кошт вырашэння наступных задач: вызначэнне асноўных канцэптаў і напрамкаў рэфлексіі беларускай філасофскай думкі першай паловы XX стагоддзя; вылучэнне ўзаемасувязей паміж асноўнымі аспектамі беларускай філасофскай думкі першай паловы XX стагоддзя.

**Асноўная частка.** Да пачатку XX стагоддзя беларуская гаспадарка адносілася да аграрнага тыпу, з нізкім узроўнем урбанізаванасці. Устаноўлена, што ў другой палове XIX стагоддзя адбылася кансервацыя беларускай вёскі і толькі на пачатку XX стагоддзя прасочваюцца прыкметныя зрухі ў працэсах урбанізацыі [1, с. 63]. Гэтая патрыярхальнасць і кансерватыўнасць пакінула свой адбітак і на спецыфічнасці развіцця духоўнага аспекту. Беларуская нацыянальная эканамічная эліта была нешматлікай [2, с. 5], а ў інтэлектуальнай сферы асноўнымі прадстаўнікамі, праз якіх ішлі працэсы рэцэпцыі тых ці іншых ідэй на беларускай геакультурнай прасторы, былі выкладчыкі і святары. У адносінах да першых трэба адзначыць, што яны, у адпаведнасці з палітыкай імперскага ўрада, якая разглядала школу як гарант стабільнасці грамадства, павінны былі праводзіць заняткі з акцэнтам на выхаванні ў першую чаргу хрысціянскіх каштоўнасцей, асабліва ў так званых "народных школах" [3, с. 14]. Такім чынам, большая частка інтэлектуалаў, якія ўплывалі на шырокія слаі насельніцтва на абшарах Беларусі, у гэты час мела рэлігійны тып светапогляду і ў адпаведнасці з афіцыйнай палітыкай урада будавала сваю рэфлексію, абапіраючыся на асноўныя пастулаты хрысціянскага веравызнання, менавіта гэтым і тлумачыцца такая абвостраная цікавасць да рэлігійнага аспекту.

Беларуская філасофская думка – шматзмястоўнае паняцце, якое ўключае розныя напрамкі рэфлексіі, прыналежныя як да заходняй, так і да ўсходняй традыцыі мыслення. Для яе характэрна адсутнасць метадалагічнасці, наяўнасць пераваг у залежнасці ад асабістых умоў існавання, належнасці да пэўнай традыцыі і асабістых сімпатый. Менавіта дзякуючы гэтаму ў межах яе праблемнага поля можна сустрэць цалкам супрацьлеглыя тэндэнцыі. У азначаны перыяд на геакультурнай прасторы Беларусі назіраецца адначасовае суіснаванне рэлігійнага накірунку і ідэй марксізму. У шэрагу апошніх можна назваць імёны Б. Быхаўскага, С. Вольфсана, С. Кацэнбогена. Агульнай падставай філасофскіх роздумаў дадзеных аўтараў была марксісцка-ленінская платформа. У яе межах першыя прадстаўнікі беларускай савецкай філасофскай школы ажыццяўлялі свае творчыя пошукі.

Напрыклад, для Б. Быхаўскага, акрамя "Нарысаў па гісторыі дыялектычнага матэрыялізму" [4], гэта была дзейнасць, накіраваная на даследаванне філасофскіх поглядаў прадстаўнікоў еўрапейскага мыслення як мінулых эпох, так і сучаснасці. У 1920-я гады з-пад яго пяра выходзяць працы "Метапсіхалогія Фрэйда", у якой робіцца спроба спалучэння матэрыялізму з канцэпцыяй З. Фрэйда [5, с. 40], і праца, прысвечаная аналізу матэрыялістычнай пазіцыі ў творчасці Спінозы "Ці быў Спіноза матэрыялістам?" [6].

Праблемнае поле навуковай творчасці С. Вольфсана складае гісторыка-філасофская тэматыка, прадстаўленая працай "Этычнае светасузіранне Спінозы" [7]. Асобна вылучаецца сацыялагічны напрамак, прысвечаны гісторыі развіцця сям'і, – "Матрыярхат і марксісцкая генеаномія" [8], "Экзагамія" [9], "Сям'я і шлюб у іх гістарычным развіцці" [10].

На праблемах марксізму С. Кацэнбоген засяроджвае ўвагу ў працы “Што такое марксізм” [11]. Трэба таксама адзначыць твор М. Нікольскага “Рэлігія як прадмет навукі”, прысвечаны аналізу дысцыпліны рэлігіязнаўства, якое ў тыя часы толькі пачало нараджацца ў якасці навукі. Аўтарам размяжоўваюцца метадалагічныя падыходы рэлігіязнаўства і багасловя ў адносінах да рэлігійнай праблематыкі [12, с. 7].

Аднак трэба адзначыць, што з’яўленне марксісцкай плыні адмоўна адлюстравалася на іншых аспектах беларускай філасофскай думкі. У першую чаргу ахвярай стаў рэлігійны напрамак. Асаблівасцю развіцця беларускай філасофскай думкі ў гэты перыяд у БССР стала падначаленасць жорсткаму таталітарнаму рэжыму, звязанаму з абмежаваннем пэўных светапоглядных установак (у тым ліку і крытыка поглядаў, якія адносяцца да ідэалістычнай плыні). Галоўнай дамінантай дадзенага часу для прадстаўнікоў беларускай савецкай філасофскай школы стала апалагетычная праца, звязаная з працэсам канструіравання новай, фундзіраванай марксізмам ідэалогіі і яе рэтрансляцыі [13, с. 8]. У сувязі з гэтым айчынныя навукоўцы не звярталіся да рэлігійнага аспекту беларускай рэлігійна-філасофскай думкі і, зразумела, не развівалі яго. Інакш склалася сітуацыя на заходнебеларускіх землях, якія патрапілі ў склад Польшчы.

Спецыфічнасць марксісцкіх прац заключаецца ў тым, што нацыянальнае пытанне застаецца па-за колам іх навуковых інтарэсаў. Іншыя беларускія мысліцелі, незалежна ад ідэалагічнай фундзіраванасці, у той ці іншай ступені закранаюць дадзеную праблему. Плённа працавалі на гэтай глебе Уладзімір Самойла (псеўданім Суліма) і Ігнат Канчэўскі (псеўданім Абдзіраловіч).

Погляды Ул. Самойлы прайшлі эвалюцыю ад цэнтрыравання на характэрнай для рускай філасофіі праблематыцы сафійнасці да зацікаўленасці становішчам і далейшымі шляхамі развіцця беларускай нацыі. Дадзеная тэма знайшла адлюстраванне ў такіх творах аўтара, як “Які "самаўрад" гатуе беларускаму народу польская рэспубліка?” і “Гэтым пераможаш”. Твор “Які “самаўрад” гатуе беларускаму народу польская рэспубліка?” прысвечаны крытыцы палітыкі польскага ўрада на абшарах Заходняй Беларусі, у творы адзначаецца антынацыянальны характар законапраектаў аб самакіраванні, прызначаных для Усходніх Крэсаў, крытыкуюцца спробы паланізацыі беларускага насельніцтва [14, с. 10]. Другая праца Ул. Самойлы “Гэтым пераможаш” высока адзначалася Ул. Конанам і была пастаўленая навукоўцам побач з вядомай працай І. Абдзіраловіча “Адвечным шляхам” [15, с. 154]. Самойла сцвярджае (і як мы ўбачым пазней, у гэтым яго погляды супадаюць з поглядамі І. Абдзіраловіча), што беларускаму народу патрэбныя жывая актыўнасць і творчы аптымізм, у якіх павінна захавацца яго асабістае і нацыянальнае “Я”, якое ёсць асновай усялякага жыцця [16, с. 160]. Уладзімір Самойла падкрэслівае выключную ролю творчасці як у працэсе самаўдасканалення, так і нацыянальнага будаўніцтва, якое павінна быць заснавана на ідэі вольнасці, свабоднай, незалежнай ад прыгнёту Захаду і Усходу Беларусі [16, с. 164]. Дадаткова трэба адзначыць, што частка творчай спадчыны Ул. Самойлы, прадстаўленая не толькі беларуска- і руска-, але і нямецкамоўнымі тэкстамі [17, с. 73–74], дагэтуль застаецца па-за межамі праблемнага поля беларускай гісторыі філасофіі і чакае сваіх даследчыкаў.

Абдзіраловіч – вынаходнік папулярнай сярод беларускіх філосафаў, гісторыкаў і культуролагаў канцэпцыі так званай “буфернай культуры” Беларусі, якая сфарміравалася ў выніку складанага геапалітычнага становішча краіны паміж Усходам і Захадам. Аўтарам адзначаецца, што геаграфічная прастора пад сённяшняй назвай “Беларусь” фактычна з X стагоддзя і да цяперашняга часу з’яўляецца полем змагання двух культурных кірункаў – еўрапейскага, які звязваецца І. Абдзіраловічам з арыйцамі, і ўсходняга. Мяжа абодвух уплываў, якая падзяляе славянскі элемент на дзве групы, згодна аўтарскаму погляду, праходзіць праз Беларусь, Украіну і Балканы [18, с. 8].

Рэлігійная філасофія прадстаўлена творамі аўтараў як каталіцкага, так і праваслаўнага кірункаў.

У беларускай філасофскай думцы праваслаўнага напрамку прасочваўся ўплыў прадстаўнікоў рускай філасофіі. Так, Т.П. Кароткая ў працы, прысвечанай станаўленню рэлігійнай філасофіі ў Беларусі на пачатку XX стагоддзя, адзначае, што прыхільнікамі ідэй “новай рэлігійнай свядомасці” былі Я. Окунь, Д. Мейчык, У. Самойла [19, с. 33], назіраліся спробы папулярызацыі ідэй славянафілаў. Шэраг артыкулаў ва ўсіх епархіяльных ведамасцях быў прысвечаны творчасці А. Хамякова, на сходах розных таварыстваў чыталіся даклады з выкладам асноўных ідэй яго філасофіі [19, с. 49]. Таксама трэба адзначыць, што сярод прадстаўнікоў праваслаўнага напрамку распаўсюджваўся варожы да ідэалогіі беларускай нацыі рух “заходнерусізму” [20, с. 25]. Асобна трэба адзначыць выхад зборнікаў “Туманы”, “Зямныя сны”, агульны настрой якіх нагадвае вядомы зборнік “Вехі”. Так, напрыклад, артыкул М. Караліцкага “Наша сучасная белетрыстыка” прысвечаны аналізу творчасці літаратараў першага дзесяцігоддзя XX стагоддзя, у ім моцна адчуваецца расчараванасць у рэвалюцыйных ідэях [21, с. 122].

Тэма адвечнай жаноцкасці, увасобленая ў рускай філасофіі ў канцэпце Сафіі, знайшла адлюстраванне ў творчасці Ул. Самойлы, які, разглядаючы праз дадзены прынцып пераходны перыяд паслярэвалюцыйных часоў, прыходзіць да высновы аб магчымым нараджэнні спадкаемцы душы Рускага свету, з якім і атаясамляе сябе [22, с. 66].

Спрабуючы даць адказ на актуальныя праблемы сучаснасці, праваслаўныя аўтары прытрымліваліся фідэістычных поглядаў, бачачы выйсце ў вяртанні да веры, каштоўнасць зместу якой перавышае ідэалагічныя і філасофскія кірункі.

Падобны пункт гледжання характэрны для А. Юрашкевіча, які адзначае, што свецкая культура, увасобленая ў навуцы і мастацтвах, нягледзячы на хуткія тэмпы развіцця, не ў стане даць належны адказ на пастаўленыя светапоглядным крызісам пытанні, адказ на іх можна знайсці толькі ў рэлігіі [23, с. 5].

Асноўнымі ідэямі, на якія абапіраліся прадстаўнікі Праваслаўнай Царквы, з'яўляліся праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць [24, с. 41], крытыка прыхільнікаў ідэалогіі заходняга шляху развіцця [25, с. 263].

У беларускай праваслаўнай думцы гэтага часу прасочваюцца водгукі прарускай і праправаслаўнай канцэпцыі М. Данілеўскага. Напрыклад, Д. Скрынчанка вылучае каталіцкі і праваслаўны свет, адзначаючы будучую смерць першага і трыумф другога. Паводле Д. Скрынчанкі, праваслаўе будзе той цэментуючай сілай, якая прывядзе чалавецтва да новага світання, ўратуе Захад ад апошняга падзення і пакажа яму новы шлях развіцця [26, с. 191].

Падобны пункт гледжання назіраецца ў працы Ст. Кульчыцкага. Ідэям і ідэалам заходнееўрапейскага асветніцтва з культам розуму, роўнасці і вяршэнствам ведаў, папулярным сярод пэўнай часткі рускай інтэлігенцыі, павінна быць адмоўлена на карысць догматаў праваслаўнай веры [27, с. 306].

У гэты ж час убачыла свет праца Д. Скрынчанкі "Каштоўнасць жыцця паводле сучаснага філасофскага і хрысціянскага вучэння", прысвечаная пытанню пошуку сэнсу жыцця, адказ на якое, згодна з аўтарскімі інтэнцыямі, можа быць знойдзены толькі з хрысціянскага пункту гледжання. Даследчыкамі адзначаецца фундзіраванасць ідэй Д. Скрынчанкі поглядамі праваслаўнага тэолага В. Нясмелава, які сцвярджаў факт усведамлення сябе чалавекам доказам існавання Абсалюта [28, с. 44].

Паводле Д. Скрынчанкі, падставай дактрын заходнееўрапейскіх аўтараў з'яўляецца шкоднае для рэлігійнага светапогляду вучэнне пантэізму, якое ўжо даўно крытыкавалася тэолагамі як праваслаўнага, так і каталіцкага абрадаў [29, с. 5].

Паводле аўтарскай класіфікацыі, філасофскія канцэпцыі падзяляюцца на песімістычныя (Леапардзі, Шапенгаўэр), аптымістычныя (Талстой, Ніцшэ) і маліарыстычныя (Дзюрынг, Сэлі) – сярэдзіна паміж песімізмам і аптымізмам. Дадзеным канцэпцыям супрацьпастаўляецца хрысціянскае вучэнне. Крытыкуючы акрэсленыя вышэй філасофскія дактрыны, Д. Скрынчанка трактуе філасофскія погляды пазначаных аўтараў як няўдалую спробу інтэрпрэтацыі хрысціянскага веравучэння, галоўнай памылкай якой стала схільнасць да пантэізму – уяўленне аб дэперсаналізаванай творчай моцы насуперак асобе Творцы [29, с. 7–8].

Папулярызацыя вышэйпазначаных ідэй праваслаўных аўтараў праводзілася праз пропаведзі, СМІ, рознага кшталту суполкі. Напрыклад, чытанні ў "Рускім Жаночым гуртку" ў Мінску. Чытанні былі прысвечаны крытыцы атэізму, ідэй сацыялізму, якія знаходзілі падтрымку ў грамадстве таго часу [25, с. 266].

Падобна аўтарам расійскіх "Вех", А. Юрашкевіч (рэктар Мінскай духоўнай семінарыі) адзначае павярхоўнае, скажонае ўспрыняцце заходнееўрапейскіх філасофскіх плыняў мясцовай інтэлігенцыяй [25, с. 267]. Ім адзначаецца і доказваецца сувязь паміж паслабленнем веры, якое ёсць вынікам уплыву пропаведзі бязвер'я, пабудаванай з дапамогай філасофскіх паняццяў, і пачаткам бунту ў чалавечай душы, які потым хутка вядзе да сацыяльных і палітычных катастроф [30, с. 299–300].

У праваслаўнай публіцыстыцы закранаецца тэма ўзаемаадносін веры і розуму, дзе розум разглядаецца ў якасці інструмента, з дапамогай якога чалавек часткова можа пазнаць Абсалют і сваю сувязь з ім. Адзначаецца не проста магчымасць, але неабходнасць пазнання розумам бязмежнай асобы Бога. Гэта павінна быць першачарговай задачай розуму. У экзістэнцыяльным вымярэнні чалавека гэта азначае, што розум павінен дасягнуць, наколькі гэта магчыма, асобы Абсалюта дзеля таго, каб увесці яго ў вобласць асабістага пазнання, а потым усталяваць з ім пэўныя адносіны [31, с. 82–83].

Адначасова назіраецца крытычнае стаўленне да каталіцкай канфесіі. Так, напрыклад, на старонках "Мінскіх епархіяльных ведамасцяў" неаднаразова з'яўляліся артыкулы, прысвечаныя крытыцы палітыкі каталіцызму на беларускіх абшарах [32–34] і інш. Гэтай жа тэме прысвечана праца Д. Скрынчанкі "Трагедыя беларускага народа" [35], у якой беларусы разглядаюцца як апалячаная і лацінізаваная частка рускіх.

Акрамя праваслаўнага накірунку, фундзіраванага, як бачна, у асноўным ідэямі рускай філасофіі, у праблемным полі беларускай рэлігійна-філасофскай думкі яскрава вылучаецца каталіцкая плынь.

Каталіцкі напрамак беларускай рэлігійна-філасофскай думкі ў ХХ стагоддзі быў вымушаны развівацца нанова. Усе папярэднія дасягненні былі перакрэслены рэпрэсіўнай палітыкай Расійскай Імперыі ў адносінах да ўсіх канфесій, акрамя праваслаўнай. Трэба адзначыць, што ў XIX стагоддзі на беларускай геакультурнай прасторы працавалі знакавыя каталіцкія аўтары, якія звярталіся да ідэй Фамы Аквінскага, распрацаваных у духу Суарэса, напрыклад, Юзэф Анджыаліні і Вінцэнтый Бучынскі [36, с. 524]. Але ў сувязі з палітычнымі падзеямі, якія аказалі значны ўплыў і на інтэлектуальныя тэндэнцыі, пераемнасці не адбылося.

Гістарычна склалася, што каталіцкае веравызнанне пасля паўстанняў XIX – пачатку XX стагоддзя было абмежавана ў сваёй дзейнасці ўрадам Расійскай Імперыі, у тым ліку на абшарах сучасных беларускіх земляў. Пачаткам аднаўлення дзейнасці каталіцкай канфесіі стала паслабленне рэлігійнай палітыкі, якое на афіцыйным узроўні было замацавана выданнем "Именного Высочайшего Указа Правительствующему Сенату" ад 17 красавіка 1905 года, згодна з якім атрымалі дазвол на існаванне на тэрыторыі Расійскай Імперыі неправаслаўныя канфесіі, і як вынік, адбыўся пераход даволі значнай часткі беларускага насельніцтва з праваслаўя ў каталіцызм.

Аналізуючы дадзеную сітуацыю, даследчык В. Грыгор'ева ў працы "Канфесіі на Беларусі" адзначае: "У хуткім часе пасля абнародавання ўказа з розных месцаў Расійскай Імперыі "с неокрепшим еще в право-

славии населением" (сюды ўлады адносілі былыя ўніяцкія мясцовасці, усходнія ўскраіны, населеныя мусульманамі, тэрыторыі, населеныя латышскім насельніцтвам і г.д.) пачалі пастапаць масавыя заявы аб прылічэнні да іншага веравызнання. Што датычылася Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай губерняў, то там адбываліся ў асноўным пераходы з праваслаўя ў каталіцтва, а ў раёнах Віцебскай губерні, населеных латышскім насельніцтвам, – у лютэранства. Задаволіць гэтыя з'явы на практыцы аказалася даволі цяжка: указ ад 17 красавіка не ўтрымліваў указання адносна механізма пераходаў. Каб запоўніць гэты прагал, рымска-каталіцкія епіскапы зрабілі распараджэнне падпарадкаванаму ім рымскакаталіцкаму духавенству аб парадку прыняцця ў каталіцкую веру тых, хто вырашыў адысці ад праваслаўя" [37, с. 112].

Адраджэнне каталіцкай канфесіі ішло адначасова разам з узмоцненай акцэнтуацыяй на пытанні нацыянальнай самасвядомасці. Менавіта дадзеная праблема стала падмуркам, на якім пачала ствараццa вялікая і моцная супольнасць беларускіх каталіцкіх інтэлектуалаў. Адам Станкевіч, вядомы беларускі дзеяч, адзначае, што на інспіраванасць аўтараў-католікаў дадзенай тэмай у першую чаргу паўплывала дзейнасць А. Ельскага, Ф. Багушэвіча, Я. Неслухоўскага і іншых аўтараў XIX стагоддзя, якія па сутнасці сталі прадвеснікамі беларускага нацыянальнага адраджэння [38, с. 461].

Ужо на пачатку XX стагоддзя, адзначае А. Станкевіч, у беларускім нацыянальным руху вылучыліся дзве плыні, першая з якіх была за эвалюцыйны шлях развіцця, а другая – за рэвалюцыйны: "Вобак зь Беларускай рэвалюцыйнай грамадой, якая паўставала ў Пецярбургу і ў Менску ў 1902 г. і ў 1903 г. была названа Беларускай сацыялістычнай грамадой, якая ня мела яшчэ пісанай праграмы і ў якую сьпярша ўваходзілі нямногія адзінкі беларускіх адраджэнцаў, – існавала такая ж беларуская група ўжо, такжа ня маючая ані апрацаванай на паперы праграмы, ані статуту, каталіцкая, ядро якой месьцілася ў Каталіцкай духоўнай акадэміі ў Пецярбургу і ў склад якога ўваходзілі такжа нямногія і такжа спосабам сьпярша неарганізаваным беларускія студэнты гэтай Акадэміі" [38, с. 467].

Такім чынам, А. Станкевіч – адзін з тых грамадскіх дзеячоў, які стаяў ля вытокаў нацыянальнага адраджэння і бачыў працэс яго ўзнікнення на ўласныя вочы. Ён сведчыць, што каталіцкіх цэнтраў, якія напачатку падтрымлівалі нацыянальнае адраджэнне было два: Пецярбургская Каталіцкая Духоўная Акадэмія і Віленская Духоўная Каталіцкая Семінарыя [38, с. 479, 481]. У той ці іншай ступені з гэтымі інтэлектуальнымі цэнтрамі звязана дзейнасць амаль усіх прадстаўнікоў каталіцкага напрамку беларускай рэлігійна-філасофскай думкі: Ф. Абрантовіч займаў пасаду прафесара ў Пецярбургскай Акадэміі, скончыў Віленскую духоўную семінарыю, потым вучыўся ў Пецярбургскай Каталіцкай Духоўнай Акадэміі; у Пецярбургу вучыліся А. Станкевіч і П. Татарыновіч; Віленскую Духоўную Семінарыю скончыў Я. Рэшаць.

Доўгі час існавала меркаванне, што каталіцкія дзеячы, якія працавалі на абшарах Беларусі ў першай палове XX стагоддзя, належалі да прадстаўнікоў прапольскай палітыкі, але, як паказваюць сведчанні, гэта далёка не так. Адначасова з прыхільнікамі польскай палітыкі у першай чвэрці XX стагоддзя пачала фарміравацца моцная каталіцкая плынь, прадстаўнікі якой адчувалі сябе беларусамі і імкнуліся сфарміраваць беларускую свядомасць у іншых. Так, сведка дадзеных падзей Антон Луцкевіч ужо ў 1912 годзе даволі выразна размяжоўвае польскі і беларускі каталіцкі напрамак на беларускай геакультурнай прасторы, падкрэсліваючы імклівае развіццё апошняга: "Між маладымі ксяндзамі (асабліва яшчэ вучашчыміся), каторыя выйшлі з вёскі і не адарваліся ад яе зусім, трапляецца ўсё болей і болей сьвядомых беларускіх патрыётаў. Дзе-нідзе – часта пад страхам свайго бліжэйшага начальства – яны ўжо пачалі ў касьцёле гаварыць казаньні па-беларуску, выдаюць катэхізмы і рэлігійныя кніжкі на беларускай мове і т.д. Усё гэта – ксяндзы-народнікі, людзі, якія скрозь свае рэлігійныя справы і ідэі ўмеюць бачыць жывы народ" [39, с. 27].

Аднак аўтар гэтых радкоў выдатна разумеў, што большая частка ксяндзоў у гэты перыяд была прадстаўлена польскім бокам: "На Беларусі дагэтуль пераважаюць ксяндзы-палякі, і польскі нацыяналізм іх не дапускае нават думкі, каб, працуючы для каталіцызму, духавенства карысталася беларускай мовай, паддзержваючы такім спосабам несымпатычны для палякаў беларускі нацыянальны рух" [39, с. 27].

Дзейнасць вышэйпазначаных ксяндзоў паклала пачатак новай культурнай плыні на беларускай геакультурнай прасторы – каталіцкаму напрамку. У яго развіцці мы можам вылучыць некалькі этапаў:

1) зараджэнне – на гэты перыяд прыходзіцца дзейнасць каталіцкіх гурткоў у Пецярбургскай духоўнай акадэміі і Віленскай духоўнай акадэміі (1905–1920 гг.). Менавіта ў гэты час працаваў адзін з першых прадстаўнікоў беларускіх каталіцкіх інтэлектуалаў Б. Пачопка, аўтар твора "Чалавек на вышыні сваёй годнасці";

2) сталасць (міжваенны перыяд) – на гэты час прыходзіцца выданне часопіса "Хрысціянская думка", а таксама шматлікая літаратура, выдадзеная выдавецтвам "Хрысціянская думка". Гэта час росквіту творчасці Ф. Абрантовіча, Я. Тарасевіча, П. Татарыновіча, Я. Рэшаця, А. Станкевіча, І. Бобіча. У дадзены перыяд творчая спадчына каталіцкага напрамку беларускай рэлігійна-філасофскай думкі значна папоўнілася працамі Ф. Абрантовіча "Касцёл і навука", "Бог", "Чалавек", Я. Тарасевіча "Беларусы ў святле праўды", "Зло і лякарства на яго", Я. Рэшаця "З гісторыі апалагетыкі", А. Станкевіча "Божае Слова: лекцыі, Эвангеліі і прамовы на нядзелі і святы". Інтэлекутальным цэнтрам каталіцкага напрамку гэтага перыяду быў ордэн марыянаў з яго галоўным апірышчам на беларускіх абшарах – мястэчкам Друяй (вядомы Друйскі кляштар айцоў-марыянаў);

3) дзейнасць прадстаўнікоў каталіцкага напрамку беларускай рэлігійна-філасофскай думкі на эміграцыі. Ахоплівае пасляваенны перыяд з 1946 па 1972 год. Дадзены перыяд прадстаўлены імёнамі Л. Гарошкі, Ч. Сіповіча, Т. Падзявы, Я. Германовіча і А. Надсана. Можна сказаць, што атрымаўшы ім-

пульс ад прадстаўнікоў папярэдняга перыяду, яны працягвалі асветніцкую дзейнасць і працу над падмуркам нацыянальнай ідэі на чужыне. Асобна трэба адзначыць выдадзеную ў гэты час працу Л. Гарошкі "Навука і рэлігія". Асноўныя погляды аўтараў на праблему будаўніцтва нацыянальнай самасвядомасці, этычныя, сацыяльныя, рэлігійныя і іншыя пытанні прадстаўлены на старонках часопісаў "Зьніч" і "Божым шляхам".

Для працы ў галіне нацыянальнай свядомасці неабходна была ідэалагічная платформа, таму зусім зразумела, што прадстаўнікі каталіцкага напрамку беларускай рэлігійна-філасофскай думкі звярнуліся да ідэй заходнееўрапейскай рэлігійнай філасофіі.

У межах каталіцкага напрамку беларускай рэлігійна-філасофскай думкі відавочна вылучаюцца два супрацьлеглых філасофскіх накірункі: неатамізм і аўгусцініянства. Да апошняга трэба аднесці творчасць Ідэльфонса Бобіча, часткова Язэпа Германовіча і Баляслава Пачопкі.

У казаннях І. Бобіча актыўна выкарыстоўваюцца прынцыпы і ўстаноўкі, характэрныя для плыні прыхільнікаў філасофскай спадчыны Аўгусціна Аўрэлія. З першага погляду падаецца, што ў сваіх развагах І. Бобіч прытрымліваецца афіцыйнага пункту гледжання, падтрымліваючы палітыку Ватыкана ў адносінах да мадэрнізму. Ён загадвае вернікам у першую чаргу прыслухоўвацца да сваіх духоўнікаў і ўвогуле да Каталіцкага касцёла таму, што менавіта іх словамі Абсалют аб'яўляе сваю волю. Аўтар у лепшых традыцыях барацьбітоў супраць ідэй мадэрнізму перасцерагае перад вучэннямі, якія маюць пазіцыю, супрацьлеглую афіцыйным поглядам Касцёла [40, с. 49]. Адначасова аўтарам адстойваецца магчымасць трансцэндэнтных шляхоў пазнання, актыўна крытыкуюцца прыхільнікі філасофскіх плыняў, якія пакідаюць па-за межамі разумення факты, што немагчыма праверыць рацыянальна або эмпірычным шляхам. Так, безумоўнай крытыцы, на думку І. Бобіча, падлягае ўсё, што ў духу пазітывізму прызнае за праўду толькі тое, што павінна быць доказана на падставе навуковых паняццяў. Галоўная памылка ў гэтым выпадку, паводле аўтара, – пакідаць па-за ўвагай даследавання ўсё, што павінна пазнавацца не эмпірычным або рацыянальным шляхамі пазнання [41, с. 6]. Бобіч імкнецца зрабіць хрысціянства адпаведным інтэлектуальнай сітуацыі яго часу. Для гэтага ім прапаноўваюцца два шляхі: першы – акцэнтуацыя тых частак Евангелля, якія могуць быць карысныя ў вырашэнні праблем сучаснасці [41, с. 4]; другі – адаптацыя новых тэорый да хрысціянскага светапогляду радыкальнымі метадамі. Згодна І. Бобічу, у самой з'яве праграсу няма нічога адмоўнага, праграс трактуецца пазітыўна, але трэба толькі зрабіць яго прыдатным для хрысціянскага свету. Паводле І. Бобіча, для гэтага ў кожнай інтэлектуальнай тэндэнцыі трэба вылучыць тое, што стасуецца з Евангеллем, і адаптаваць да патрэб грамадства, а ўсё тое, што застаецца за межамі хрысціянскай аксіялогіі, трэба адмовіць [41, с. 11].

Але, нягледзячы на шматлікія заклікі аўтара прытрымлівацца афіцыйнай пазіцыі Касцёла, адначасова ў поглядах І. Бобіча выразна прасочваецца ўплыў ідэй аўгусцініянства – аўтарам прыніжаецца роля цялеснага пачатку, які разглядаецца як нешта адмоўнае, супрацьлеглае духоўнаму праграсу. Так, напрыклад, у яго творчасці часам можна сустрэць радкі, якія пацвярджаюць яго прыхільнасць да аўгусцінізму: "Адносна нашай душы злосныя ваўкі – гэта чорт, свет і цела, вось ад іх абараніць нас збаўца назаўсёды" [41, с. 10]. Адзначаецца перманентны зварот і спасылкі на аўтарытэт Аўгусціна Аўрэлія [41, с. 11; 42, с. 28] у якасці аднаго з найбуйнейшых хрысціянскіх мысліцеляў, у той час як постаць Фамы Аквінскага, нягледзячы на афіцыйны заклік Ватыкана да папулярызацыі творчай спадчыны Аквіната, не згадваецца ўвогуле.

Выкарыстанне догмаў аўгусцініянства ў спрошчаным выглядзе характэрна і для творчасці Я. Германовіча. Так, сустракаецца ўласцівы для дадзенай плыні дуалізм супрацьпастаўлення субстанцый душы і цела. Германовічам адзначаецца традыцыйная для поглядаў прыхільнікаў аўгусцініянства палярнасць свету, дзе чалавек разглядаецца як своеасаблівае поле барацьбы. На адным полюсе знаходзіцца цела чалавека, мэтай якога ёсць адыход ад Бога, звязаны з грахоўнымі пачуццямі і жаданнямі, на другім – чалавечая душа, якая імкнецца да выратавання [43, с. 5].

Яшчэ адзін аўтар, антрапалагічныя погляды якога знаходзяцца пад уплывам ідэйных установак аўгусцінізму, – Б. Пачопка. У творы "Чалавек на вышыні сваёй годнасці", выкарыстоўваючы супрацьпастаўленне духоўнага і матэрыяльнага пачаткаў, ён выказвае думкі, падобныя да роздумаў папярэдніх аўтараў. Для асэнсавання ступені належнасці аўтара да дадзенай інтэлектуальнай традыцыі трэба звярнуць асаблівую ўвагу на ход яго разважанняў. У творчасці Б. Пачопкі прадстаўлены тэндэнцыі, уласцівыя творчасці папярэдніх аўтараў: проціпастаўленне і палярнасць душы і цела ў чалавеку, тлумачэнне цела як матэрыі, часовага, страчанага, адмоўнага, якому павінна супрацьстаяць інтэлектуальная субстанцыя душы: "Душа і цела – гэта дзьве розныя як бы істоты, каторыя маюць кожная сваё асобнае жаданьне, свае асобныя мэты. Душа заўсёды рвёцца дзесьці ў гару, да піекнасьці і шчасьця трывалаго. Цела, як само з матэрыі, капалося б заўсёды каля зямлі і тут шукало б сабе здаваленьняў. Душа дамагаіцца, каб чалавек рабіў усім добра, каб не пэцкаўся сам у брудныя рэчы і другіх не цягнуў у штоколечы падобнае. Цела, не зважаючы, ці гэта каму будзе ўцешна, ці крыўдна, ці моральна, ці грэшна і брудна, кажа чалавеку шукаць здаваленьняў змысловых (цялесных), хоць яны вельмі часта і таму самаму чалавеку ня йдуць на карысць і здароўе. Гэтак між душой і целам вядзецца безупынная вайна" [44, с. 3–4].

Наяўнасць у беларускай рэлігійна-філасофскай думцы прыхільнікаў аўгусцініянства тлумачыцца тым, што, нягледзячы на афіцыйнае патрабаванне выкарыстання і распаўсюджвання ідэй неатамізму, не-

каторыя тэолагі па розных прычынах апынуліся ў апазіцыі да лініі Ватыкана, падтрымліваючы спірытуалістычныя кірункі. Дадзеная тэндэнцыя была ўласцівая не толькі для Беларусі, але і для ўсяго каталіцкага свету і спрыяла развіццю мадэрнісцкага напрамку.

Цяжкасці, звязаныя з супрацьстаяннем аўгусцініянскага і тамістычнага напрамку ў рэлігійнай філасофіі XX стагоддзя, адзначае, напрыклад, Б. Кузміцкас, даследуючы канцэпцыі каталіцкага мадэрнізму. Ён заўважае, што праект папы Льва XIII злучыць каталіцкі свет у адзіную культурную і інтэлектуальную прастору шляхам адапатацыі тамізму да праблем сучаснасці і выкарыстання яго для ўзмацнення філасофскай і сацыяльнай дактрын не меў поспеху менавіта з дадзенай прычыны. У якасці маўклівай апазіцыі, прапанаванай філасофскай дактрыне неатамізму ў шматлікіх каталіцкіх школах, духоўных семінарыях, манаскіх ордэнах, захаваліся спірытуалістычныя тэндэнцыі, якія мелі крыніцай у асноўным вышэйзгаданы аўгусцінізм [45, с. 42].

Прысутнасць у беларускай рэлігійна-філасофскай думцы ідэйных установак менавіта тамізму зазначыў І. Трацяк, указваючы на фундзіраванасць прац Ф. Абрантовіча, К. Сваяка, Я. Тарасевіча, Б. Пачопкі, А. Станкевіча і У. Талочкі ідэямі вучэння Фамы Аквінскага [46, с. 15]. Адначасова трэба адзначыць, што даследаванне інтэрпрэтацыі дадзеных ідэй, шляхоў запазычання і асноўнага зместу гэтай канцэпцыі ў творчасці беларускіх аўтараў у працы І. Трацяка не знайшло належнага з пункту гледжання гісторыі філасофіі адлюстравання. Таксама аўтар памылкова звязвае дзейнасць прадстаўнікоў каталіцкага напрамку рэлігійна-філасофскай думкі з філасофскай плыняй тамізму, а як вядома, паняцце тамізму значна шырэйшае, чым неатамізм.

**Заключэнне.** Відавочна, што беларуская філасофская думка – шматвектарны феномен, у межах якога паспяхова развіваліся сістэмы і знаходзілі месца тэндэнцыі часам абсалютна супрацьлеглых філасофскіх сістэм. Адначасова трэба адзначыць, што большая частка беларускіх мысліцеляў у той ці іншай ступені ўключала ў арбіту сваёй рэфлексіі праблему самавызначэння беларускай нацыі. Тычыцца гэта і рэлігійна-філасофскай беларускай думкі, прадстаўленай праваслаўным і каталіцкім напрамкам. Насуперак склаўшымся гістарычным стэрэатыпам трэба адзначыць, што менавіта на пачатку XX стагоддзя ўзнікае моцная беларуская каталіцкая плынь у галіне філасофскай думкі. На гэты момант ужо існавалі цэнтры, якія змаглі аб'яднаць вакол сябе маладых каталіцкіх інтэлектуалаў у адзіную моцную плынь. Імпульсам да яе з'яўлення стала патрэбнасць асэнсавання нацыянальнага пытання і неабходнасць выпрацавання пэўнай стратэгіі працы ў гэтым накірунку. Але для будаўніцтва ідэалогіі нацыянальнай самасвядомасці быў патрэбны філасофскі падмурак – тыя першасныя ідэі, якія забяспечаць адзінства карціны свету. Менавіта таму беларускія аўтары каталіцкага напрамку звярнуліся да філасофскіх установак аўгусцініянства і неатамізму.

ЛІТАРАТУРА


1. Шыбека, З. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзя) / З. Шыбека. – Мінск: Цэнтр еўрапейскага супрацоўніцтва "Эўрафорум", 1997. – 319 с.
2. Пуцік, У.С. Прычыны амбежавання ўдзелу буржуазіі ў беларускім нацыянальным руху на мяжы XIX–XX стст. / У.С. Пуцік // Весці БДПУ. Серыя. 2. – № 4. – 2008. – С. 7–10.
3. Снапкоўская, С.В. Гісторыя адукацыі і педагагічный думкі Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.) / С.В. Снапкоўская. – Мінск: НІА, 2001. – 160 с.
4. Быховский, Б.Э. Очерк философии диалектического материализма / Б.Э. Быховский. – М., 1930. – 244 с.
5. Быховский, Б.Э. Метапсихология Фрейда / Б.Э. Быховский. – Минск, 1926. – 40 с.
6. Быховский, Б.Э. Был ли Спиноза материалистом? / Б.Э. Быховский. – Минск, 1928. – 35 с.
7. Вольфсон, С.Я. Этическое миросозерцание Спинозы / С.Я. Вольфсон. – Минск, 1927. – 16 с.
8. Вольфсон, С.Я. Матриархат и марксистская генеономия / С.Я. Вольфсон. – Минск, 1928. – 30 с.
9. Вольфсон, С.Я. Экзогамия / С.Я. Вольфсон. – Минск, 1928. – 16 с.
10. Вольфсон, С.Я. Семья и брак в их историческом развитии / С.Я. Вольфсон. – Минск, 1937. – 244 с.
11. Каценбоген, С.З. Что такое марксизм / С.З. Каценбоген. – Минск, 1925. – 156 с.
12. Никольский, Н.М. Религия как предмет науки / Н.М. Никольский. – Минск, 1923. – 47 с.
13. Новік, І.М. С.Я. Вальфсон і беларуская савецкая філасофія 20-х гг. XX ст. / І.М. Новік // Весці Нац. Акад. навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2013. – № 1. – С. 5–9.
14. Суліма, У. Які "самаўрад" гатуе беларускаму народу польская рэспубліка / У. Суліма. – Вільня, 1924. – 32 с.
15. Конон, В.Н. Пророк в своем отечестве / В.Н. Конон // Нёман. – 1992. – № 1. – С. 154–157.
16. Самойло, Вл. Сим победишь / Вл. Самойло // Нёман. – 1992. – № 1. – С. 158–186.
17. Гарбінскі, Ю. Уладзімір Самойла ў нямецкім друку (1927–1935): праблематыка і жанравая спецыфіка публікацыяў / Ю. Гарбінскі // Acta Albaruthenica. – 2008. – № 8. – С. 72–83.
18. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьеветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 43 с.
19. Короткая, Т.П. Религиозная философия в Белоруссии начала XX века / Т.П. Короткая. – Минск: Наука и техника, 1983. – 108 с.

20. Конон, В.М. Демократическая эстетика Белоруссии (1905–1917 гг.) / В.М. Конон. – Минск: Наука и техника, 1971. – 149 с.
21. Королицкий, М. Наша современная беллетристика / М. Королицкий // Туманы: сб. – Минск, 1909. – С. 117–132.
22. Самойло, Вл. Александр Блок / Вл. Самойло // Туманы: сб. – Минск, 1909. – С. 40–66.
23. Юрашкевич, А. Слово на праздник Рождения Христова / А. Юрашкевич // Минские епархиальные ведомости. – 1908. – № 1. – С. 2–8.
24. Ш-ский, Автоном. Две лепты / Автоном Ш-ский // Минские епархиальные ведомости. – 1908. – № 1. – С. 41–44.
25. Юрашкевич, А. Чтения в “Русском религиозном кружке в г. Минске. 1-е чтение / А. Юрашкевич // Минские епархиальные ведомости. – 1908. – № 10. – С. 262–282.
26. Скрынченко, Д. Христос Воскресе! / Д. Скрынченко // Минские епархиальные ведомости. – 1908. – № 8. – С. 190–191.
27. Кульчицкий, Ст. Поучение в день рождения Государя Императора Николая Александровича / Ст. Кульчицкий // Минские епархиальные ведомости. – 1908. – № 11. – С. 300–310.
28. Христианство в Беларуси: история и современность / Короткая, Т.П. [ и др.]. – Минск: Общественное объединение “Молодежное научное сообщество”, 2000. – 71 с.
29. Скрынченко, Д. Ценность жизни по современно-философскому и христианскому учению / Д. Скрынченко. – СПб., 1908. – 164 с.
30. Юрашкевич, А. “Ясное в науке” и “неясное в религии” / А. Юрашкевич // Минские епархиальные ведомости. – 1905. – № 17. – С. 297–314.
31. Юрашкевич, А. “Ясное в науке” и “неясное в религии” / А. Юрашкевич // Минские епархиальные ведомости. – 1905. – № 17. – С. 297–314.
32. М.К. Мариавиты о папстве // Минские епархиальные ведомости. – 1908. – № 13–14. – С. 395–399.
33. Католический листок “о непорочном зачатии Божией Матери” // Минские епархиальные ведомости. – 1908. – № 16. – С. 485–489.
34. Лучшее средство в борьбе с католицизмом // Минские епархиальные ведомости. – 1908. – № 16. – С. 489–495.
35. Скрынченко, Д. Трагедия белорусского народа / Д. Скрынченко. – Минск: Тип. С.А. Некрасова, 1908. – 18 с.
36. Шалькевич, В.Ф. Полоцкая неосхоластика / В.Ф. Шалькевич // Мировоззренческие и философско-методологические основания развития современного общества: Беларусь, регион, мир; под ред. Т.А. Адуло. – Минск, 2008. – С. 524–525.
37. Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX ст.) / В.В. Грыгор’ева [і інш.]. – Мінск, 1998. – 340 с.
38. Станкевіч, А. Беларускі рух хрысціянскі / А. Станкевіч // З Богам да Беларусі: збор твораў. – Вільня: Інстытут Беларусістыкі, 2008. – С. 453–568.
39. Навіна, А. На дарозе да новага жыцця / А. Навіна // Маладая Беларусь. Серыя 1. – Сш 1. – Пецярбург, 1912. – С. 11–36.
40. Bobič, I. Niadzełišnija Ewanhełii i nawuki C. 1 / I. Bobić. – Wilno, 1922. – 67 s.
41. Bobič, I. Niadzełišnija Ewanhełii i nawuki. C. 2 / I. Bobić. – Wilno, 1921. – 74 s.
42. Bobič, I. Niadzełišnija Ewanhełii i nawuki. C. 3 / I. Bobić. – Wilno, 1921. – 66 s.
43. Hiermanovič, J. Nadpryrodnaje žyccio / J. Hiermanovič // Chryścijanskaja Dumka. – 1934. – № 8. – S. 4–6.
44. Pačopka, B. Čalaviek na vyšyni svajoj hodnasci / B. Pačopka. – Wilno, 1915. – 87 s.
45. Кузмицкас, Б. Философские концепции католического модернизма / Б. Кузмицкас. – Вильнюс: Минтис, 1982. – 208 с.
46. Трацяк, І. Культурна-асветніцкая дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў (пачатак XX ст. – 1939 г.): аўтарэф. дыс. … канд. культуралогіі: 24.00.01 / І. Трацяк. – Гродна, 2000. – 20 с.


*Пастуиіў 03.11.2014*

## BELARUSIAN PHILOSOPHICAL LANDSCAPE OF THE FIRST HALF TWENTIETH CENTURY

***H. KLIMOVICH***

*The article covers the specific features of development Belarusian philosophy in the first half of the twentieth century. Eclectic is the main characteristic of the Belarusian thought during this period. Researchers note that Belarusian geo-cultural space was the place for coexistence diametrically opposite philosophical directions. However, not the all of these philosophical ideas from this problematic field are steel investigated. We can notice by the well-known movements of social-democratic ideas and movement of “zapadnorusizm” the great stratum of insufficiently explored phenomenon of the Belarusian religious-philosophical thought, reflection on a national problem, so the aim of this article to determine all the main directions and specific features of the Belarusian thought during the first half of the twentieth century.*